лежа). Рэж.-пастаноўшчык спектакляў: «Людзі на балоце» паводле І.Мележа (1970), «Трыбунал» А.Макаёнка (1971), «Брама неўміручасці» К.Крапівы (1978), «Адкуль грэх?» А.Петрашкевіча (1979), «Прывітанне, сінічка!» Я.Стэльмаха (1980), «Паўлінка» Я.Купалы (1982), «Партрэт мадэмуазэль Таржы» І.Ялагіна (1991).



*Я.Колас.*

**КО́ЛАС** Якуб [Тамаш Булава, Мікалаевец, Дзядзька Карусь, Стары Шут, Лесавік, Адзінокі, Наднёманец і інш.; сапр. Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч, 3.11.1882, в. Акінчыцы (цяпер у межах г. Стоўбцы) — 13.8.1956], класік беларускай літаратуры; разам з Я.*Купалам* заснавальнік сучаснай бел. л-ры і літ. мовы. Нар. паэт Беларусі (1926). Акадэмік НАН Беларусі (1928). Засл. дзеяч навукі Беларусі (1944). Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1902). У 1902—06 настаўнічаў ў вёсках Люсіна (цяпер Ганцавіцкі р-н) і Пінкавічы (цяпер Пінскі р-н), у Верхменскім нар. вучылішчы (цяпер Смалявіцкі р-н). За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе 15.9.1908 асуджаны на 3 гады і зняволены ў астрог. У 1912—14 К. — настаўнік Пінскага прыходскага вучылішча. У 1-ю сусв. вайну з 1915 быў на фронце. З вер. 1917 настаўнічаў у г. Абаянь Курскай вобл. (Расія). У 1921 па выкліку бел. ўрада пераехаў у Мінск, дзе выкладаў у Бел. пед. тэхнікуме, БДУ, працаваў у навук.-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы, Інбелкульце. З 1929 з'яўляўся чл. Прэзідыума і віцэ-прэзідэнтам АН Беларусі. У Вял. Айч. вайну К. знаходзіўся ў эвакуацыі, вёў навук. і грамадскую дзейнасць. З 1944 працаваў у Мінску. Большасць ранніх вершаў класіка (1898—1902) напісана на рус. мове. Першы друкаваны твор — верш «Наш родны край» («Наша доля», 1906, №1). У яго першым зб. вершаў «Песні-жальбы» (1910) пераважала тэма цяжкага лёсу бел. селяніна. Раскрываючы сац. праблемы, К. узбагаціў бел. паэзію пейзажнай і філас. лірыкай (вершы «Нёман», «Першы гром», «Вясной»). Разнастайная па тэматыцы і ахопе жыццёвых праяў проза К. гэтага часу: зб-кі «Апавяданні» (1912), «Родныя з'явы» (1914). У вершах 1914—16 («Думкі салдата», «Ворагам») паэт асуджаў імперыялістычную вайну, яе антынар. характар. У апавяданнях «Васіль Чурыла», «Малады дубок» выявілася майстэрства псіхал. аналізу. Глыбокім філас. зместам напоўнены алегарычныя апавяданні з цыкла «Казкі жыцця» (1921). Паэма «Новая зямля» (1911—23) — класічны твор бел. л-ры. У ім намалявана шырокая панарама нар. жыцця, створаны тыповыя характары, паказана духоўнае багацце, унутраная прыгажосць селяніна-працаўніка, яго мара аб волі і шчасці. Наватарства паэмы — у паэтызацыі працы, эстэтызацыі сялянскага побыту, услаўленні чалавека працы. Лірыка-эпічная паэма «Сымон-музыка» сімвалізуе бел. нац. адраджэнне, веліч бел. народа, раскрывае трагічны лёс Беларусі. Праблемамі далейшага лёсу Айчыны насычаны творы, што ўвайшлі ў зб. «Рэха» (1922). Сталасць светапогляду пісьменніка адлюстравалася ў трылогіі «На ростанях» (1923—54). Тут створана галерэя вобразаў нац. інтэлігенцыі пач. 20 ст., паказаны быт сялян, выявілася майстэрства К.-пейзажыста. Гал. тэмы аповесці «На прасторах жыцця» — лёс вясковай моладзі ў 1920-я гг. Аповесць «Адшчапенец» (1930—31) прысвечана калектывізацыі ў вёсцы. У п'есах «Вайна вайне» (1927—31, апошняя рэдакцыя 1938), «У пушчах Палесся» (1938), аповесці «Дрыгва» (1933) гучыць тэма 1-й сусветнай і Грамадз. войн. Паэма «Рыбакова хата» (1939—47) раскрывае барацьбу ў Зах. Беларусі супраць сац. бяспраўя. У зб-ках «Адпомсцім» (1942), «Голас зямлі» (1943), паэмах «Суд у лесе» (1943), «Адплата» (1945), публіцыст. артыкулах перыяду Вял. Айч. вайны услаўляў гераізм і патрыятызм бел. народа. К. — адзін з заснавальнікаў бел. дзіцячай л-ры. Псіхалогія дзяцей тонка раскрыта паэтам у вершаваных творах «Раквусач» (1926), «Міхасёвы прыгоды» (1934) і інш. К. — аўтар падручнікаў «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909), «Методыка роднай мовы» (1926). К. плённа працаваў у галіне перакладу («Палтава» А.Пушкіна, паасобныя творы А.Міцкевіча, М.Лермантава, Т.Шаўчэнкі, Р.Тагора і інш.). Яго творы перакладзены на многія мовы свету. З імем пісьменніка — аднаго з рэд. «Руска-беларускага слоўніка» (1953) — звязана станаўленне норм бел. літ. мовы. Творчасць К. натхніла дзеячаў мастацтва на стварэнне твораў, звязаных з яго жыццём і дзейнасцю. Паводле апавяданняў, аповесцей, трылогіі К. ставіліся п'есы ў многіх бел. тэатрах. На словы паэта пісалі свае творы бел. кампазітары Л.Абеліёвіч, У.Алоўнікаў, І.Лучанок, У.Мулявін, Р.Пукст, А.Туранкоў. Яго творчасць узбагаціла бел. опернае мастацтва: паводле аповесці «Дрыгва» Ю.Багатыровым створана адна з першых нац. опер «У пушчах Палесся» (1939), Ю.Семянякам напісана опера «Новая зямля» (1982) паводле аднайм. паэмы. У бел. кіно пакінулі след фільмы паводле твораў К. — «Першыя выпрабаванні» (па трылогіі «На ростанях», рэж. У.Корш-Саблін, 1960), «Новая зямля» (рэж У.Траццякоў, 1982). Жыццё і творчасць пісьменніка пакладзены ў аснову дакум. фільмаў «Народны паэт» (1952, рэж. Ю.Тарыч), «Якуб Колас» (1962, рэж. П.Шамшур), «Дзядзька Якуб» (1981, В.Сукманаў). Імя К. прысвоена Ін-ту мовазнаўства і Цэнтр. навук. б-цы НАН Беларусі, драм. тэатру ў Ві-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цебску, паліграфкамбінату ў Мінску, школам, б-кам плошчам і вуліцам у многіх гарадах і населеных пунктах Беларусі. Дзейнічаюць *Коласа Якуба літаратурна-мемарыяльны музей, Коласа Якуба літаратурна-мемарыяльнага музея філіял*, *Коласа Якуба літаратурна-краязнаўчы музей*, створаны *Коласаўскі заказнік*. З 1966 прысуджаецца Дзярж. прэмія імя К. (за творы прозы і літ.-знаўства). З 1985 у Мінску штогод праводзяцца навук. канферэнцыі «Каласавіны». У 1996 створаны міжнар. фонд К. Помнікі паэту пастаўлены ў Мінску на плошчы яго імя і на магіле на Вайсковых могілках, на радзіме ў в. Мікалаеўшчына, у г. Навагрудак, в. Плоскае Талачынскага р-на. У мясцінах, звязаных з жыццём і дзейнасцю К., на будынках устаноў, дзе працаваў пясняр, — мемар. дошкі. Творчасць К. вывучае *коласазнаўства*.

*Тв.*: Зб. твораў. Т. 1—14. Мінск, 1972—78; Зб. твораў. У 20 т. Т. 1—19. Мінск, 2007—12.

*Літ.*: Мушынскі М.І. Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці. Мінск, 1982; Міцкевіч Д.К. Любіць і помніць: успамінае сын Якуба Коласа. Мінск, 2000; Лужанін М. Колас расказвае пра сябе: аповесць-эсэ. Мінск, 2010; Трафімчык А.В. Якуб Колас — вядомы і невядомы. Мінск, 2012.

*В.І.Еўмянькоў.*

Архив библиотеки МГУ имени